**Л.А.Дзямешка**, *прафесар*

# МАДЭЛІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАКТЫКІ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ

Бібліятэчная практыка студэнтаў ФБІС з'яўляецца галоўнай часткай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Гэта першая ступень прымянення тэарэтычных ведаў ва ўмовах бібліятэчнай дзейнасці, першае назапашванне прафесійнага вопыту, усведамленне сябе суб'ектам вытворчай дзейнасці калектыву.

На факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм па спецыяльнасці Г.12.01.00 "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" існуюць розныя спецыялізацыі: "менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы", "навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі", "публічныя бібліятэкі", "дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", "бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова", "бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура", "аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы". Практыка для іх арганізуецца наступным чынам: на другім курсе для студэнтаў усіх спецыялізацый прадугледжана азнаямленчая вучэбная практыка. Асноўнай формай яе правядзення з'яўляецца групавая або падгрупавая арганізацыя з выкананнем заданняў у аб'ёме, вызначаным праграмай. Студэнты без адрыву ад заняткаў наведваюць бібліятэкі, набываюць агульнае ўяўленне аб бібліятэчна-інфармацыйных установах, знаёмяцца з бібліятэкамі розных тыпаў і відаў. У аснову вучэбнай практыкі пакладзена дысцыпліна "Бібліятэказнаўства. Тэорыя". На гэтым этапе адбываецца першапачатковае асэнсаванне студэнтамі сваёй суб'ектнай функцыі ў бібліятэчных калектывах.

Пагаджаючыся з прыярытэтам фундаментальнай прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў, паспрабуем змадэліраваць бібліятэчную практыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яе мадэль — сістэма дзеяння і ўзаемадзеяння студэнтаў, выкладчыкаў ФБІС, бібліятэчных работнікаў баз практыкі, накіраванага на фарміраванне высокіх прафесійных якасцей будучага бібліятэкара. Метадалагічнай асновай мадэлі з'яўляецца канцэпцыя падрыхтоўкі спецыяліста як суб'екта бібліятэчнага асяроддзя. Суб'ектнасць бібліятэкара — гэта яго здольнасць асэнсоўваць сваё месца ў гэтай сферы.

Істотнымі ўласцівасцямі гэтага працэсу з'яўляюцца зацікаўленасць у абранай прафесіі; станоўчае самаадчуванне ў працоўным калектыве; здольнасць кіраваць дзеяннямі, эмоцыямі, практычна ацэньваць, перайначваць рэчаіснасць, крытычна ставіцца да сябе, паважаць супрацоўнікаў і карыстальнікаў бібліятэкі; уменне мадэліраваць, планаваць спосабы дзеяння пры стасунках з чытачамі, рэалізаваць планы і праекты, кантраляваць іх ход і ацэньваць вынікі сваіх дзеянняў.

Крытэрыем суб'ектнасці з'яўляецца гатоўнасць асобы да прафесійнай дзейнасці па спецыялізацыі ў якасці камплектатара, каталагізатара, бібліёграфа, работніка аддзела абслугоўвання і інш.

Гэтая гатоўнасць з'яўляецца ўласцівасцю асобы, патрабуе наяўнасці ведаў, уменняў і навыкаў, пастаяннага іх прымянення, ацэнкі сваіх магчымасцей у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі, задачамі, неабходнасцю дасягнення пэўных вынікаў.

Мадэль бібліятэчнай практыкі мае на ўвазе бесперапыннасць яе на працягу навучання ва універсітэце. Яна складаецца з трох этапаў: 1) першапачатковага асэнсавання студэнтам сваёй суб'ектнасці ў бібліятэчным асяроддзі; 2) самавызначэння найбольш прыярытэтных і прывабных накірункаў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі ўстаноўкамі і якасцямі (здольнасцямі, зацікаўленасцю, творчымі захапленнямі, магчымасцямі і інш.); 3) мадэліравання прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці са спецыялізацыяй. Апісанне этапаў складаецца з наступных кампанентаў: курса, віду,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працягласці практыкі; яе мэт, задач і зместу; практычных заданняў, арганізацыйных формаў.

## Мадэль бібліятэчнай практыкі студэнтаў ФБІС па спецыяльнасці Г.12.01.00 "бібліятэказнаўства і бібліяграфія"

I этап, 2-гі курс
Вучэбная азнаямленчая практыка
(36 гадзін на працягу 5-ці тыдняў без адрыву ад заняткаў)

***Мэты, задачы***

Першапачатковае асэнсаванне студэнтам сваёй суб'ектнасці ў бібліятэчна-інфармацыйным асяроддзі:

— усведамленне існавання бібліятэчна-інфармацыйных устаноў розных тыпаў і відаў;

— замацаванне ведаў аб бібліятэчна-інфармацыйных працэсах, атрыманых пры вывучэнні дысцыпліны "Бібліятэказнаўства. Тэорыя";

— фарміраванне дыягнастычных уменняў будучых спецыялістаў;

— фарміраванне інтэлектуальных арыентацый будучых спецыялістаў;

— адаптацыя ў бібліятэчным асяроддзі.

***Змест***

Азнаямленне з:

— функцыямі, задачамі бібліятэчна-інфармацыйных сістэм;

— структурай бібліятэчна-інфармацыйных устаноў розных тыпаў і відаў;

— дзейнасцю адміністрацыі і функцыянальнымі абавязкамі супрацоўнікаў;

— дзейнасцю структурных падраздзяленняў, планаваннем іх работы і справаздачнасцю;

— аўтаматызацыяй бібліятэчна-інфармацыйных працэсаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— бібліятэчна-інфармацыйнымі паслугамі і прадуктамі;

— праектамі і мэтавымі праграмамі бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;

— асаблівасцямі фарміравання фонду дакументаў, стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў;

— асаблівасцямі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк.

***Практычныя заданні і арганізацыйныя формы***

Збор матэрыялаў у адпаведнасці са зместам практыкі для выкарыстання іх на семінарскіх занятках і пры вывучэнні дысцыпліны "Бібліятэказнаўства. Тэорыя" і іншых спецдысцыплін.

Экскурсіі ў бібліятэчна-інфармацыйныя ўстановы розных тыпаў і відаў адзін раз у тыдзень.

Сустрэчы з адміністрацыяй, супрацоўнікамі, карыстальнікамі бібліятэк, спажыўцамі інфармацыі.

Наведванне бібліятэчных мерапрыемстваў.

Удзел у круглых сталах, семінарах, канферэнцыях бібліятэкараў.

## II этап. 4-ты курс
## Бібліятэчная вытворчая практыка па агульнай праграме для ўсіх спецыялізацый
## (працягласць 8 тыдняў)

***Мэты, задачы***

Самавызначэнне студэнтам найбольш прыярытэтных і прывабных накірункаў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі ўстаноўкамі і якасцямі (здольнасцямі, зацікаўленасцю, творчымі захапленнямі, магчымасцямі):

— усведамленне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці як адзінага складанага працэсу па максімальным задавальненні запытаў і патрэбнасцей абанентаў;

— усведамленне спецыфікі дзейнасці супрацоўнікаў з профілем рэгіёна, тыпам і відам установы;

— фарміраванне практычных уменняў і навыкаў у розных накірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

— асэнсаванне прыярытэтных напрамкаў дзейнасці, прагрэсіўных методык, сучасных бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій;

— асэнсаванне неабходнасці творчага падыходу і вырашэння праблем.

***Змест***

Вывучэнне арганізацыі і тэхналогіі работы бібліятэк і іх інфармацыйных службаў:

— замацаванне ведаў аб структурным фондзе дакументаў, яго галіновых, відавых, тэматычных, моўных характарыстыках;

— набыццё практычных уменняў і навыкаў работы ў аддзелах абслугоўвання, камплектавання, бібліятэчна-інфармацыйных, метадычна-даследчых, у кнігасховішчах і інш.;

— знаёмства з інструкцыйна-метадычнымі матэрыяламі па бібліяграфічным апісанні і сістэматызацыі дакументаў, тыпавымі і рабочымі табліцамі класіфікацыі, са структурай каталогаў, з выкарыстаннем электроннага каталога;

— знаёмства са структурай бібліятэчнага абслугоўвання, маркетынгавым падыходам да яго, з паслугамі і прадуктамі дзейнасці па абслугоўванні карыстальнікаў;

— знаёмства з арганізацыяй бібліяграфічна-інфармацыйнай службы бібліятэкі, ДБА бібліятэкі і яго выкарыстаннем, базамі даных, арганізацыяй, зместам, формамі і метадамі бібліяграфічнага навучання чытачоў.

***Практычныя заданні і арганізацыйныя формы***

Групавое і індывідуальнае выкананне практычных заданняў у галінах бібліятэчных дакументаў, каталагізацыі дакументаў, бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў, бібліяграфічнага абслугоўвання.

Аналіз зместу работы АБІС (розных падсістэм). Праца ў АРМе "камплектатар", "каталагізатар", "бібліёграф", "бібліятэкар аддзела абслугоўвання" і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Збор матэрыялу для падрыхтоўкі курсавой работы і ў перспектыве дыпломнай.

Практыка ва ўсіх структурных падраздзяленнях базавай установы.

## III этап. 5-ты курс
## Бібліятэчная вытворчая практыка ў адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй (працягласць 8 тыдняў)

### *Мэты, задачы*

Мадэліраванне будучым спецыялістам асабістай прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй:

— выпрацоўка асабістых прафесійных якасцей, неабходных у рабоце;

— дзейнасны і творчы падыход да вырашэння бібліятэчных праблем;

— выяўленне даследчых здольнасцей у пэўным накірунку бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

— максімальнае авалоданне сучаснымі тэхналогіямі і прагрэсіўнымі методыкамі;

— выпрацоўка ўласнага стылю ў працы і ў вытворчым калектыве.

### *Змест*

Выяўленне ведаў і замацаванне набытых у папярэдняй вытворчай практыцы ўменняў і навыкаў па:

— мадэліраванні, камплектаванні, уліку, апрацоўцы, размеркаванні па структурных падраздзяленнях і захаванні бібліятэчнага фонду;

— каталагізацыі, сістэматызацыі, прадметызацыі дакументаў;

— выяўленні, складанні бібліяграфічных запісаў, анатаванні, стварэнні і выкарыстанні бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных;

— абслугоўванні розных катэгорый карыстальнікаў;

— правядзенні масавых і комплексных мерапрыемстваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— арганізацыі работы бібліятэк, планаванні, уліку і справаздачнасці, навукова-метадычнай і даследчай рабоце бібліятэк.

Змест практыкі поўнасцю адпавядае спецыялізацыі, максімальна набліжаны да спецыфікі дзейнасці базавых устаноў.

***Практычныя заданні і арганізацыйныя формы***

Практычныя заданні датычаць наступных раздзелаў:

— бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, фарміраванне бібліятэчнага фонду і кіраванне ім, каталагізацыя дакументаў, абслугоўванне карыстальнікаў;

– бібліяграфічна-інфармацыйная дзейнасць.

У залежнасці ад спецыялізацыі пэўныя заданні па раздзелах пашыраны ці, наадварот, звужаны.

Брыгада студэнтаў-практыкантаў прымае ўдзел у навукова-даследчай рабоце базы практыкі, рэалізацыі іх праектаў і праграм.

Заканчваецца трэці этап фарміравання спецыяліста пераддыпломнай практыкай, калі адбываюцца канчатковая дапрацоўка і афармленне дыпломнай работы.

Як сведчыць прапанаваная мадэль бесперапыннай бібліятэчнай практыкі, кожны этап паступовага станаўлення прафесіяналізму студэнта магчымы пры выкананні зместу практыкі, што вызначаецца праграмамі, распрацаванымі згодна з Палажэннем аб вытворчай практыцы і вучэбным планам факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Мадэль, на наш погляд, уносіць сістэму ў змест практыкі, адкрывае шляхі далейшага яе ўдасканалення ў кантэксце стандартызацыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ